Дадатак 2

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАЎ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## 1. Вучэбныя праграмы

У 2023/2024 навучальным годзе будуць выкарыстоўвацца вучэбныя праграмы, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі ў 2023 годзе. Вучэбныя праграмы размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы /* ***Беларуская мова***, ***Беларуская літаратура***.

Па вучэбных прадметах у вучэбныя праграмы ўнесены наступныя змяненні:

**Вучэбны прадмет «Беларуская мова»**

У вучэбнай праграме па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»:

скарэкціравана колькасць гадзін у IX і XI класах (на 34 вучэбныя тыдні замест 35) у адпаведнасці з часткай 2 пункта 2 артыкула 150 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей – Кодэкс);

пераразмеркаваны вучэбныя гадзіны на напісанне навучальных і кантрольных пісьмовых работ;

сфармуляваны віды творчых работ;

забяспечана сістэмнасць у патрабаваннях да ведаў і ўменняў вучняў, прадстаўленых у раздзеле вучэбных праграм «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў»: па кожным раздзеле вучэбнай праграмы прапісаны патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў вучняў;

удакладнены змест адукацыі з мэтай зніжэння вучэбнай нагрузкі на вучняў і ўліку дыдактычнага прынцыпу паслядоўнасці і пераемнасці ў навучанні;

уніфікавана структура вучэбных праграм: у X–XI класах, як і ў V – IX класах, прапісаны патрабаванні да ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па кожным раздзеле вучэбнай праграмы.

**Вучэбны прадмет «Беларуская літаратура»**

У вучэбнай праграме па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура»:

скарэкціравана колькасць гадзін у IX і XI класах (на 34 вучэбныя тыдні замест 35) у адпаведнасці з часткай 2 пункта 2 артыкула 150 Кодэкса;

пераразмеркаваны вучэбныя гадзіны на напісанне навучальных і кантрольных пісьмовых работ;

у першай главе вучэбных праграм прыведзены пералік асобасных і метапрадметных кампетэнцый, фарміраванне якіх прадугледжана адукацыйнымі стандартамі;

аптымізаваны змест вучэбных праграм – забяспечана пераемнасць у асваенні пытанняў гісторыі і тэорыі літаратуры, паступовае набыццё ведаў у адпаведнасці з агульнадыдактычнымі прынцыпамі паслядоўнасці і пераемнасці ў навучанні, выключаны неабавязковыя для запамінання тэарэтычныя паняцці;

удакладнены пералік мастацкіх твораў для вывучэння з мэтай узмацнення выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура».

Усе вучэбныя праграмы размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы* / ***Беларуская мова***, ***Беларуская літаратура***.

Звяртаем увагу на ўнесеныя змяненні ў дадаткі 4 і 5 да «Метадычных рэкамендацый па фарміраванні культуры вуснага і пісьмовага маўлення ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі»:

у дадатку 4 від работы «Тэставая работа (з часткай С)» заменены на «Тэставая работа»;

у дадатку 5 скарэкціраваны аб’ём кантрольных і навучальных пераказаў у X–XI класах з улікам узроўню (базавы або павышаны) вывучэння вучэбнага прадмета;

у дадатку 5 указаны аб’ём кантрольных сачыненняў. Аб’ём навучальных сачыненняў вызначаецца настаўнікам з улікам дыдактычнай задачы, жанру, тэматыкі сачынення, асаблівасцей арганізацыі адукацыйнага працэсу ў канкрэтным класе і наяўнасці вучэбнага часу.

**2. Вучэбныя выданні**

У новым навучальным годзе ў адукацыйным працэсе будуць выкарыстоўвацца вучэбныя выданні, уключаныя ў «Пералік вучэбных выданняў, якія прыгодныя для выкарыстання ў бібліятэчных фондах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у 2023/2024 навучальным годзе» (зацверджаны Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь А. І. Іванцом 06.02.2023 г.). Гэты дакумент апублікаваны ў бюлетэні Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Зборнік нарматыўных дакументаў» (№ 7, 2023), размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя /* ***Пералікі вучэбных выданняў***.

Электронныя версіі вучэбных дапаможнікаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (http://e-padruchnik.adu.by).

Да 2023/2024 навучальнага года перавыдадзены з улікам вынікаў вопытнай праверкі, вывучэння меркаванняў настаўнікаў і вучняў наступны вучэбны дапаможнік:

Лазарук, М. А. Беларуская літаратура : вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т. У. Логінава, Г. А. Сухава. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023.

У параўнанні з папярэднім выданнем вучэбны дапаможнік істотна дапрацаваны: з мэтай узмацнення выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (выхавання патрыятычных пачуццяў, фарміравання сістэмы маральна-этычных якасцей, паважлівых адносін да сямейных каштоўнасцей і інш.) уключаны вершы В. Шніпа «Сям’я» і М. Шабовіча «Хоць не бачыў чужых я краін…», да новых твораў распрацаваны метадычны апарат; прадстаўлены партрэты пісьменнікаў замест спасылак на электронны адукацыйны рэсурс; істотна перапрацаваны артыкулы па тэорыі літаратуры; дапоўнены спасылкамі тэксты твораў; дададзены эпіграфы да раздзелаў «Чарадзейная сіла мастацтва», «У вершах і ў прозе», «Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі», «Мастацкая літаратура, публіцыстыка» і да кожнага мастацкага твора; дапрацаваны метадычны апарат вучэбнага дапаможніка (скарэкціраваны асобныя пытанні і заданні да раздзелаў і мастацкіх твораў).

Рэкамендацыі па рабоце з вучэбнымі дапаможнікамі размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы /* ***Беларуская літаратура***.

Да 2023/2024 навучальнага года падрыхтавана новае выданне для настаўнікаў:

Праскаловіч, В. У. Беларуская літаратура ў 5 класе : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / В. У. Праскаловіч, Т. У. Логінава, М. В. Жуковіч ; пад рэд. В. У. Праскаловіч. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2023.

У дапаможніку размешчаны метадычныя рэкамендацыі да правядзення ўрокаў розных тыпаў па беларускай літаратуры ў V класе. Матэрыялы і метадычныя парады, змешчаныя ў ім, дапамогуць настаўніку паспяхова рэалізаваць асноўныя патрабаванні вучэбнай праграмы, цікава, змястоўна, насычана праводзіць урокі беларускай літаратуры.

Уся інфармацыя аб вучэбна-метадычным забеспячэнні адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура» да 2023/2024 навучальнага года размешчана на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы /* ***Беларуская мова***, ***Беларуская літаратура***.

**3. Арганізацыя адукацыйнага працэсу на павышаным узроўні**

На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучэбныя прадметы «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» могуць вывучацца на павышаным узроўні ў VIII і IX класах у аб’ёме не больш за дзве дадатковыя вучэбныя гадзіны на тыдзень.

Рэкамендацыі па арганізацыі вывучэння беларускай мовы і літаратуры на павышаным узроўні размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы* / ***Беларуская мова***, ***Беларуская літаратура***.

Пры вывучэнні вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» ў X і XI класах на павышаным узроўні выкарыстоўваюцца электронныя дадаткі для павышанага ўзроўню: «Беларуская мова. 10 клас», «Беларуская літаратура. 10 клас», «Беларуская мова. 11 клас», «Беларуская літаратура. 11 клас», размешчаныя на рэсурсе (*http://profil.adu.by*), яны ўключаюць вучэбны матэрыял базавага і павышанага ўзроўняў. Адначасова могуць выкарыстоўвацца друкаваныя выданні вучэбных дапаможнікаў, прызначаныя для вывучэння беларускай мовы і беларускай літаратуры на базавым узроўні.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі адукацыйнага працэсу на павышаным узроўні ў X–XI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы* / ***Беларуская мова***, ***Беларуская літаратура***.

У 2023/2024 навучальным годзе будзе праводзіцца вопытная праверка наступных вучэбных выданняў:

Жуковіч М. В. [і інш.]. Беларуская літаратура. Вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. У 2 ч.;

Валочка Г. М. [і інш.]. Беларуская мова. Вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання;

Бадзевіч З. І., Саматыя І. М. Беларуская мова. Вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

## 4. Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу

**Падрыхтоўка да нацыянальнага даследавання якасці адукацыі. Фарміраванне функцыянальнай адукаванасці вучняў сродкамі вучэбнага прадмета**

У лістападзе 2023 года плануецца правядзенне новага для краіны маніторынгавага даследавання – Нацыянальнага даследавання якасці адукацыі, у якім прымуць удзел вучні X класа.

Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі накіравана на праверку функцыянальнай адукаванасці вучняў – здольнасці, якая забяспечвае эфектыўнае функцыянаванне чалавека ў розных сферах жыццядзейнасці.

Актуальную інфармацыю аб падрыхтоўцы да даследавання можна знайсці на нацыянальным адукацыйным партале https://adu.by/ *Галоўная / **Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі (НДЯА)***.

Трэніровачныя варыянты дыягнастычнай работы будуць размешчаны ў пачатку 2023/2024 навучальнага года.

На ўроках **беларускай мовы** асновай для фарміравання функцыянальнай, перш за ўсё чытацкай, адукаванасці з’яўляецца тэкст, прычым не толькі мастацкі, але і навуковы, афіцыйны, у тым ліку тэксты розных жанраў (біяграфіі, дакументы, артыкулы з газет і часопісаў, інструкцыі і інш.). Пры арганізацыі працы з тэкстам варта акцэнтаваць увагу вучняў на авалоданні такімі групамі ўменняў: 1) пошук і знаходжанне інфармацыі, 2) інтэрпрэтацыя і інтэграцыя інфармацыі, 3) ацэнка зместу і формы тэксту, 4) выкарыстанне інфармацыі тэксту для рашэння практычных задач.

Варта адзначыць, што вучэбнымі праграмамі па беларускай мове прадугледжаны віды дзейнасці, якія так ці інакш звязаны з фарміраваннем чытацкай адукаванасці: вучэбнае паведамленне на аснове матэрыялаў вучэбнага дапаможніка, складанне плана, тэзісаў, канспекта тэксту; самастойнае складанне табліц, схем, алгарытмаў, апорных канспектаў для абагульнення і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу; комплексны аналіз тэксту; пераканструяванне сказаў; пераклад з рускай мовы на беларускую; пераказ, сачыненне.

З мэтай фарміравання ў вучняў уменняў пошуку інфармацыі пры навучанні беларускай мове мэтазгодна:

выпрацоўваць навыкі разумення сутнасці сфармуляванага задання (Пра што гэта заданне? Што трэба зрабіць, каб яго выканаць?), а таксама прапаноўваць вучням тлумачыць, якім чынам яны знайшлі/выбралі патрэбную адзінку інфармацыі, як знайсці ключавыя словы/выразы для адказу на пытанне і г. д.;

прапаноўваць заданні, у якіх для адказу на пытанне неабходна выкарыстоўваць прыём перафразавання, сінанімічныя замены;

вучыць самастойна фармуляваць пытанні да тэксту, адказы на якія знаходзяцца ў адным або некалькіх фрагментах тэксту ў яўным ці няяўным выглядзе, і інш.

Такія заданні дапамогуць вучням лепш арыентавацца ў тэксце, знаходзіць неабходную адзінку інфармацыі для адказу на тое ці іншае пытанне.

Фарміраванню ўменняў інтэграваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, рабіць вывады і падагульненні спрыяюць прадугледжаныя вучэбнай праграмай па беларускай мове віды дзейнасці, звязаныя з той ці іншай перапрацоўкай інфармацыі: напісанне розных відаў пераказаў (падрабязны, сціслы, выбарачны); складанне тэзісаў; канспектаванне; напісанне рэферата.

З мэтай фарміравання ўмення перапрацоўваць схематычна прадстаўленую інфармацыю ў тэкст і наадварот можна рэкамендаваць наступныя віды заданняў:

падабраць тэкст да ілюстрацыі або ілюстрацыю да тэксту, параўнаць ілюстрацыйны і тэкставы матэрыял, абгрунтаваць сваё меркаванне;

суаднесці малюнак/табліцу/графік/дыяграму з патрэбнай інфармацыяй у тэксце;

скласці вуснае або пісьмовае выказванне на аснове тэкставай і/або графічнай інфармацыі;

скласці ўласны ілюстрацыйны матэрыял (маршрут, буклет, храналагічную табліцу) да тэксту, пракаменціраваць яго.

Уменні ацэнкі зместу і формы тэксту ўключаюць уменне ацэньваць элементы тэксту (прыкладаў, аргументаў, ілюстрацый) адносна мэт аўтара; форму тэксту (структуру, стыль, тып), мэтазгоднасць выкарыстаных аўтарам прыёмаў; камунікатыўны намер аўтара тэксту; вызначаць адрасата тэксту; разумець прызначэнне структурнай адзінкі тэксту, выкарыстанага аўтарам прыёму; ацэньваць дакладнасць інфармацыі, якая змяшчаецца ў адным або некалькіх тэкстах.

Рэкамендаваныя вучэбнымі праграмамі віды дзейнасці (аналіз тэксту з мэтай выяўлення сродкаў мастацкай выразнасці; комплексны аналіз тэксту; стылістычны аналіз тэксту, супастаўляльны аналіз тэкстаў і інш.) накіраваны на фарміраванне ў вучняў уменняў не толькі разумець змест тэксту, але і яго жанр, структуру, мову, стыль і тып маўлення, мэтазгоднасць і прызначэнне выкарыстаных моўных сродкаў і сродкаў маўленчай выразнасці. Асаблівай увагі патрабуе фарміраванне ўменняў ацэньваць якасць і дакладнасць тэксту, выяўляць і аналізаваць супярэчнасці паміж тэкстамі або часткамі тэксту, тэкстам і інфармацыяй, пададзенай у графічнай форме.

Уменне выкарыстоўваць інфармацыю тэксту для рашэння практычных задач прадугледжвае стварэнне звязнага выказвання пэўнага тыпу, стылю і жанру маўлення, што складае адзін з асноўных напрамкаў, якія рэалізуюцца пры навучанні беларускай мове, – развіццё звязнага маўлення. Такія заданні накіраваны на стварэнне вучнямі розных па стылі

і жанры выказванняў у адпаведнасці з вызначанай мэтай і сферай зносін (аргументаваны адказ на пытанне, сачыненне-апісанне, сачыненне-разважанне, сачыненне-апавяданне, заява, інфармацыйны запыт, памятка, эсэ і інш.).

З мэтай развіцця ўмення выкарыстоўваць інфармацыю тэксту для рашэння практычных задач неабходна сістэматычна і паслядоўна практыкаваць наступныя віды дзейнасці:

звязаныя з фармуляваннем на аснове атрыманай з тэксту інфармацыі ўласнага меркавання (выказванне ўласнага меркавання наконт праблемы, якая абмяркоўваецца ў тэксце);

прагназаваннем падзеі на аснове інфармацыі тэксту або выяўленнем сувязі паміж прачытаным і сучаснай рэчаіснасцю;

дапаўненнем тэксту (напрыклад, уставіць у тэкст апісанне героя/мясцовасці/з’явы прыроды і г. д. або закончыць тэкст);

напісаннем сачыненняў разнастайнай тэматыкі, водгукаў, рэцэнзій, нарысаў, эсэ і інш., якія развіваюць уменне звязна выкладаць свае думкі ў пісьмовай форме.

Такім чынам, для фарміравання ў вучняў чытацкай адукаванасці на ўроках беларускай мовы мэтазгодна выкарыстоўваць:

прыём згортвання (выключэнне, абагульненне зыходнай інфармацыі; пераканструяванне зместу ў план, канспект, рэферат, табліцу, схему, дыяграму) і разгортвання тэксту (прывядзенне і каменціраванне фактаў, прыкладаў, дэталізацыя, аргументацыя тэзісаў);

работу з featурнафарматнымі тэкстамі: 1) суцэльнымі (апавяданні, вершы, артыкулы, сачыненні), 2) несуцэльнымі, інфармацыя ў якіх перадаецца не толькі вербальна, але і з дапамогай табліц, графікаў, схем, ілюстрацый (расклад руху транспарту, схемы праезду, афішы, карты сайтаў, рэкламныя постары), 3) змешанымі, якія складаюцца з набору элементаў суцэльных і несуцэльных фарматаў, 4) множнымі (састаўнымі), што ўключаюць у сябе некалькі тэкстаў, кожны з якіх быў створаны незалежна ад іншага і з’яўляецца звязным і завершаным;

вывучэнне сукупнасці тэкстаў, у структуры якіх выкарыстаны гіперспасылкі на дадатковыя матэрыялы візуальнага і невізуальнага характару; выкананне заданняў, якія патрабуюць прыцягнення дадатковых крыніц інфармацыі;

работу са змешанымі тэкстамі, якая ўключае не толькі працу з традыцыйнымі апавяданнем, апісаннем і разважаннем, але і іншымі тыпамі – тлумачэннем, абгрунтаваннем, каментарыем, інструкцыяй;

параўнанне, супастаўленне і супрацьпастаўленне тэматычна звязаных тэкстаў, складанне інструкцый, рэкамендацый, алгарытмаў;

вызначэнне тыпу/стылю/жанру, прымет тэксту, выяўленне аўтарскай задумы, аналіз не толькі тэкставай структуры і кампазіцыі на аснове

вядомай і даступнай інфармацыі, але і кантэкстнае, сітуацыйнае прымяненне прачытанага.

На ўроках **беларускай літаратуры** ў працэсе вывучэння і аналізу мастацкіх твораў з мэтай фарміравання функцыянальнай адукаванасці, найперш чытацкай, а менавіта ўменняў пошуку пэўнай інфармацыі ў тэксце, яе інтэрпрэтацыі і выкарыстання, ацэнкі зместу і формы тэксту, стварэння ўласнага тэксту, рэкамендуецца:

прапаноўваць вучням творчыя заданні, якія заахвочваюць да правядзення паралелей паміж творамі класічнай літаратуры і сучаснай рэальнасцю («Як выглядаў бы акаўнт (аватар, статус, нікнэйм) героя ў сацыяльнай сетцы?», «Што сказаў бы герой, прачытаўшы сённяшнія навіны?», «Кім стаў бы герой у сучасным грамадстве?»), з актуальнымі для вучняў жыццёвымі сітуацыямі;

актыўна выкарыстоўваць у навучальным працэсе практыка-арыентаваныя заданні на кампетэнтнаснай аснове, скіраваныя на прымяненне атрыманых ведаў у паўсядзённым жыцці (прыклады такіх заданняў можна знайсці ў зборніках серыі «Кампетэнтнасны падыход»);

рабіць акцэнт на міжпрадметных сувязях: супастаўляць творы беларускай і рускай літаратур – знаходзіць падабенства і адрозненне, выяўляць кантэкстуальнае і тыпалагічнае ўзаемадзеянне; супастаўляць творы літаратуры і іншых відаў мастацтва; прапаноўваць заданні на творчае перасатварэнне тэксту (намаляваць / падабраць ілюстрацыю, зрабіць інсталяцыю / калаж / жывую скульптуру, напісаць сцэнарый / сінопсіс, падабраць / запісаць музычнае суправаджэнне, прадставіць тэкст як комплекс тактыльных адчуванняў, геаметрычных вобразаў); выкарыстоўваць веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні іншых вучэбных прадметаў, у працэсе чытання і аналізу мастацкага твора (устанавіць гістарычны кантэкст; вызначыць адлегласць, якую пераадолеў герой, або пабудаваць маршрут; успомніць геаграфічныя асаблівасці месца дзеяння твора; вызначыць кошт чаго-небудзь у сучасных беларускіх рублях);

надаваць асаблівую ўвагу выяўленню аўтарскай пазіцыі, а таксама падабенству і адрозненню пунктаў гледжання: а) аўтара і яго герояў, б) аўтара і вучня, в) некалькіх вучняў або г) літаратурных крытыкаў;

працаваць над ацэнкай мастацкага тэксту (прычын напісання ў пэўны час у канкрэтным месцы канкрэтным аўтарам, жанравай прыроды і формы прадстаўлення, кампазіцыйнага рашэння, стылістычных асаблівасцей, задумы і яе ўвасаблення), а таксама над выяўленнем сувязяў твора з іншымі тэкстамі аднаго часу, мастацкага кірунку, жанру, тэмы, аўтара; фармуляваць ацэначныя меркаванні адносна тэксту і падтэксту, выказваць крытычнае стаўленне да яго, рабіць уласныя высновы;

прапаноўваць вучням заданні ў форме тэстаў, накіраваныя на даслоўнае разуменне складанага тэксту, пошук значных мастацкіх дэталяў, устанаўленне паслядоўнасці эпізодаў, знаходжанне яўна і няяўна прадстаўленай, праўдзівай і лжывай інфармацыі (пры дастатковым узроўні падрыхтаванасці навучэнцы могуць скласці такія заданні самастойна).

Для фарміравання функцыянальнай адукаванасці таксама на ўроку неабходна ствараць умовы для актыўных зносін, выкарыстоўваць індывідуальныя і камандныя формы работы, заданні на авалоданне навыкамі рэфлексіі. Немалаважна, асабліва на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, развіваць навыкі самастойнай працы.

Неабходныя для фарміравання функцыянальнай адукаванасці ўменні шмат у чым пераклікаюцца з патрабаваннямі да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, заяўленымі ў вучэбных праграмах, таму спецыяльнай падрыхтоўкі і распрацоўкі новага метадычнага інструментарыю не патрабуецца, дастаткова будзе ўзмацніць некаторыя кампаненты вучэбных заняткаў.

**Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу вучэбных прадметаў**

У 2023/2024 навучальным годзе актуальнай застаецца рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» ў адукацыйным працэсе з мэтай фарміравання ў вучняў пачуцця патрыятызму, грамадзянскасці, павагі да гістарычнага мінулага, стваральнай працы як галоўнай умовы развіцця беларускай дзяржавы. Рашэнне гэтых задач павінна спрыяць фарміраванню атмасферы міру і згоды ў беларускім грамадстве і быць звязана з дасягненнем вучнямі асобасных адукацыйных вынікаў, адлюстраваных у адукацыйных стандартах і вучэбных праграмах.

Вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце **«Беларуская мова»** прадугледжана дасягненне вучнямі наступных асобасных адукацыйных вынікаў: валоданне беларускай мовай як сродкам пазнання свету, далучэння да культуры як сістэмы каштоўнасцей і нормаў паводзін; валоданне пачуццём патрыятызму, грамадзянскасці, захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці ў полікультурным соцыуме; дэманстрацыя ўстойлівай цікавасці да самастойнай дзейнасці, самапазнання, самаразвіцця; здольнасць да супрацоўніцтва і камунікацыі ў розных сітуацыях і ўмовах маўленчых зносін. Пры пастаноўцы выхаваўчых задач урока варта арыентавацца на названыя асобасныя адукацыйныя вынікі.

У змесце вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў найбольшай ступені на дасягненне асобасных адукацыйных вынікаў арыентаваны тэмы «Мова – найважнейшы сродак зносін», V клас; «Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа», VI клас; «Валоданне літаратурнай мовай – асноўны паказчык культуры чалавека», VII клас;

«Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры», VIII клас і інш., а таксама раздзелы «Маўленне», «Тэкст», «Стылі маўлення», «Культура вуснага і пісьмовага маўлення».

Патрыятычнае выхаванне на ўроках беларускай мовы рэалізуецца праз прывіццё любові і павагі, свядомага стаўлення да мовы як духоўнай каштоўнасці, сродку зносін і атрымання ведаў у розных сферах чалавечай дзейнасці. Асаблівай увагі патрабуе асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці, фарміраванне ўсвядомленага ўспрымання вучнямі беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання традыцый, маральных ідэалаў грамадства; фарміраванне ў вучняў пачуцця прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці, эстэтычнай вартасці беларускай мовы.

Багатым выхаваўчым патэнцыялам валодаюць культуразнаўчыя тэксты, якія выкарыстоўваюцца на ўроках мовы ў якасці дыдактычнага матэрыялу. Падчас працы з такімі тэкстамі мэтазгодна праз каментарый або аналіз зместу звяртаць увагу вучняў на факты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа: традыцыі, мараль, побыт, жыццёвую філасофію, каштоўнасці, нацыянальныя сімвалы і інш. Асаблівую ўвагу варта засяродзіць на знакавых падзеях гісторыі Беларусі, якія сведчаць пра гераічнае мінулае краіны, подзвігі герояў Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Пры падборы дыдактычнага матэрыялу да вучэбных заняткаў рэкамендуецца аддаваць перавагу такім практыкаванням і заданням, якія сваім зместам выхоўваюць у вучняў любоў і павагу да мовы, Радзімы, яе прыроды; спрыяюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскасці, патрыятызму, павагі да гістарычнага мінулага народа.

З мэтай рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета рэкамендуецца выкарыстоўваць актыўныя метады і формы навучання (арганізацыя гутарак, публічных выступленняў, дыскусій, дыспутаў па праблемных пытаннях, сітуацыях, падрыхтоўка дакладаў, паведамленняў, стварэнне тэкстаў пэўнага стылю і жанру, тэкстаў на адну тэму ў розных стылях маўлення, напісанне работ даследчага характару і інш.). Варта выкарыстоўваць міжпрадметныя сувязі беларускай мовы з літаратурай і іншымі вучэбнымі прадметамі, акцэнтаваць увагу на ідэях, якія фарміруюць патрыятызм і грамадзянскасць.

Вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце **«Беларуская літаратура»** прадугледжана дасягненне вучнямі наступных асобасных адукацыйных вынікаў: сфарміраванасць маральных каштоўнасных арыентацый, цэласнай сістэмы поглядаў на свет; успрыманне сябе як грамадзяніна беларускай дзяржавы, усведамленне сваёй этнічнай прыналежнасці; праяўленне павагі да нацыянальнай культурнай спадчыны; усведамленне значнасці сацыяльна адказных паводзін;

праяўленне міжэтнічнай і міжкультурнай талерантнасці; гатоўнасць і здольнасць да ўзаемаразумення, дыялогу і супрацоўніцтва; паважлівае стаўленне да чужога меркавання; здольнасць да эстэтычнага ўспрымання навакольнага свету; дэманстрацыя ўстойлівай цікавасці да самастойнай дзейнасці, самаразвіцця, самапазнання; праяўленне эмацыянальнай сталасці, гатоўнасць да выбару адукацыйнай траекторыі ў адпаведнасці з уласнымі магчымасцямі, здольнасцямі і інтарэсамі.

Пры фармулёўцы выхаваўчых задач урока неабходна арыентавацца на названыя асобасныя адукацыйныя вынікі. Важным сродкам дасягнення вучнямі асобасных вынікаў з’яўляецца разуменне імі каштоўнасных арыенціраў пісьменнікаў і літаратурных герояў.

Прыярытэтнай задачай урокаў беларускай літаратуры з’яўляецца фарміраванне ў вучняў патрыятычных каштоўнасных арыентацый, павагі да гістарычнага мінулага. Важная роля ў яе вырашэнні адводзіцца літаратурнай адукацыі ў сувязі з бясспрэчнымі выхаваўчымі магчымасцямі мастацкай літаратуры. Асаблівую ўвагу неабходна надаваць творам патрыятычнага і грамадзянскага зместу. Перш за ўсё гэта творы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Подзвіг нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, усё ім перажытае і здзейсненае, бязмежная мужнасць, патрыятычная самаахвярнасць, уменне перамагаць – гэта маральны капітал, з якога новыя пакаленні чэрпаюць духоўную сілу, асэнсоўваюць бясспрэчную каштоўнасць мірнага неба над галавой.

У гэтым кантэксце неабходна актыўна выкарыстоўваць на ўроках экранізацыю мастацкіх твораў, якія выклікаюць асаблівы эмацыянальны водгук у вучняў, paраўнальнае вывучэнне твораў патрыятычнага зместу беларускай і рускай літаратур.

Пры вывучэнні мастацкіх твораў, у якіх расказваецца пра пакуты людзей на вайне («Васількі» Міхася Лынькова, «Над спаленай вёскай…» Аркадзя Куляшова, «Незагойная рана» Васіля Быкава, «Пошукі будучыні» Кузьмы Чорнага), а таксама пры правядзенні пазакласнай работы па вучэбным прадмеце неабходна звяртаць увагу на праблему **генацыду** беларускага народа з апорай на гісторыі ўласных сем’яў вучняў, дакументальныя факты (напрыклад, «Хатынскі спіс», кнігі серыі «Памяць»).

Метадычныя рэкамендацыі па адлюстраванні палітыкі **генацыду** беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны на акупіраванай тэрыторыі Беларусі з выкарыстаннем інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў і дакументаў аб **генацыдзе**, сабраных Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь, размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / **Метадычныя рэкамендацыі, указанні***.

Важна, каб у працэсе такой работы маладое пакаленне беларусаў разумела неабходнасць захавання памяці пра ахвяр **генацыду**, а таксама беражлівых адносін да гістарычнага мінулага, захавання міру і каштоўнасці стваральнай працы. Пры гэтым трэба ўлічваць узроставыя і індывідуальныя асаблівасці вучняў.

На ўроках беларускай літаратуры рэкамендуецца:

пры вывучэнні жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў акцэнтаваць увагу на тых момантах, якія дэманструюць вучням узор паводзін Чалавека і Грамадзяніна, Працаўніка і Барацьбіта за мір;

пры аналізе літаратурнага твора звяртаць увагу вучняў на словы і ўчынкі літаратурных герояў, якія ілюструюць гуманныя адносіны да навакольнага свету (беражлівыя адносіны да прыроды, культурнай спадчыны краіны); прававую і маральную культуру (выкананне законаў і захаванне маральных нормаў, усведамленне агульначалавечых каштоўнасцей); грамадзянска-патрыятычную пазіцыю (паважлівыя адносіны да гісторыі і культуры сваёй краіны, жаданне прынесці ёй карысць); паважлівыя адносіны да працы, імкненне павышаць свой узровень адукацыі і г. д.

Пры вывучэнні літаратурных твораў рэкамендуецца ўключаць вучняў у розныя віды дзейнасці, прапаноўваць ім разнастайныя заданні, накіраваныя на аналіз жыццёвых сітуацый, у якіх апынуліся літаратурныя героі, прынятых героямі рашэнняў. Важна, каб пры гэтым вучні давалі маральна-этычную ацэнку ўчынкам і падзеям, усведамлялі і прымалі (або не прымалі) духоўна-маральныя ідэалы герояў; знаходзілі ў мастацкіх творах арыенціры для ўласных паводзін у розных жыццёвых абставінах.

Для рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага прадмета ў працэсе работы з мастацкім творам прапануецца выкарыстоўваць наступныя заданні:

заданні, арыентаваныя на практычную дзейнасць і сувязь са штодзённым жыццём (параўнальны аналіз пейзажных карцін у мастацкім творы і навакольнай прыроды; ліст ветэрану, заснаваны на ўражанні аб вывучаным творы пра Вялікую Айчынную вайну; дыспут пра маральны выбар герояў твораў; стварэнне інтэрнэт-старонак, прысвечаных памятным падзеям, апісаным у літаратурных творах);

заданні, якія дазваляюць звязаць вывучаемы матэрыял з асабістым сацыяльным вопытам і ўяўленнямі пра паводзіны людзей у грамадстве (інсцэніраванне фрагментаў мастацкіх твораў з наступным абмеркаваннем; стварэнне альтэрнатыўных сюжэтных ліній, фіналаў твораў з улікам змен у характары герояў, іх учынках; літаратурныя віктарыны, эстафеты, конкурсы; падрыхтоўка літаратурнай экскурсіі);

заданні, накіраваныя на выяўленне асобасных адносін вучняў да мастацкага твора, яго герояў (маляванне героя, падбор ілюстрацый,

стварэнне вокладкі для кнігі, дзённікавых запісаў героя, падрыхтоўка эмацыянальнай партытуры настрою героя, складанне дыягнастычнай карты паводзін героя і інш.).

На ўроках беларускай літаратуры асаблівую ўвагу неабходна надаваць развіццю культуры маўлення вучняў, уменню карэктна адносіцца да іншых меркаванняў, праяўляць паважлівыя адносіны да субяседнікаў.

Неабходна ўлічваць, што асноватворным падмуркам любога ўрока літаратуры з’яўляецца непасрэдная праца з тэкстам мастацкага твора, які становіцца адпраўным пунктам у працэсе бесперапыннага выхавання.

Улічваючы вялікі адукацыйны патэнцыял экскурсій, значную колькасць экскурсійных аб’ектаў і турыстычных маршрутаў у Рэспубліцы Беларусь, у 2023/2024 навучальным годзе рэкамендуецца прадоўжыць арганізацыю і правядзенне экскурсій. Варта прадугледзець арганізацыю экскурсій для вучняў I–XI класаў у рамках арганізацыі адукацыйнага працэсу на працягу любога навучальнага дня тыдня (з панядзелка па пятніцу), а таксама ў пазаўрочны час, у тым ліку і ў шосты школьны дзень.

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі экскурсій для вучняў I–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму агульнай сярэдняй адукацыі, пералік экскурсійных аб’ектаў і турыстычных маршрутаў, якія рэкамендуюцца для наведвання навучэнцамі, размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале*:* ў раздзеле нацыянальнага адукацыйнага партала: https://vospitanie.adu.by/ *Арганізацыя выхавання / **Метадычныя рэкамендацыі***.

**Вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў**

Для арганізацыі і правядзення факультатыўных заняткаў прапануецца выкарыстоўваць вучэбныя праграмы, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пералік вучэбна-метадычных комплексаў для факультатыўных заняткаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура» і вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале: https://adu.by/ *Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы* / ***Беларуская мова***, ***Беларуская літаратура***.

**5. Дадатковыя рэсурсы**

Карысную інфармацыю пры падрыхтоўцы да вучэбных заняткаў можна знайсці на наступных ***інтэрнэт-рэсурсах***:

http://edu.gov.by – Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;

https://adu.by – нацыянальны адукацыйны партал;

http://www.belarus.by/ru/travel/heritage – афіцыйны сайт Рэспублікі Беларусь;

https://www.belstat.gov.by – афіцыйны сайт Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь;

https://www.nlb.by – Нацыянальная бібліятэка Беларусі;

http://www.kupalauski.by – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы;

http://bellit.museum.by/be – Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры;

http://bagdanovich.museum.by – Літаратурны музей Максіма Багдановіча;

http://www.yakubkolas.by – Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа;

http://www.kupala-museum.by – Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы;

http://www.lim.by – рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом „Звязда“».

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу можна выкарыстоўваць адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс (https://eior.by). Яго прызначэнне – падтрымка навучэнцаў, якія атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам, а таксама навучэнцаў, якія па ўважлівых прычынах часова не могуць наведваць установу адукацыі.

Пры планаванні і арганізацыі пазакласнай работы па беларускай мове і літаратуры рэкамендуецца звярнуць увагу на каляндар юбілейных дат і каляндар міжнародных свят, якія будуць адзначацца ў 2023/2024 навучальным годзе.

**Каляндар юбілейных дат**

Верасень: 85-годдзе з дня нараджэння Анатоля Грачанікава
110-годдзе з дня нараджэння Сяргея Грахоўскага

Кастрычнік: 110-годдзе з дня нараджэння Эдзі Агняцвет

Лістапад: 90-годдзе з дня нараджэння Вячаслава Адамчыка
75-годдзе з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц

Снежань: 80-годдзе з дня нараджэння Казіміра Камейшы

Студзень: 125-годдзе з дня нараджэння Міхася Лынькова
100-годдзе з дня нараджэння Алеся Савіцкага
120-годдзе з дня нараджэння Алеся Якімовіча

Люты: 110-годдзе з дня нараджэння Аркадзя Куляшова

| | |
|---|---|
| Сакавік: | 95-годдзе з дня нараджэння Еўдакіі Лось<br>105-годдзе з дня нараджэння Міколы Лупсякова<br>70-годдзе з дня нараджэння Міколы Мятліцкага |
| Май: | 120-годдзе з дня нараджэння Паўлюка Труса |
| Чэрвень: | 100-годдзе з дня нараджэння Васіля Быкава |

**Каляндар міжнародных і дзяржаўных свят**

| | | |
|---|---|---|
| 3 верасня | – | Дзень беларускага пісьменства |
| 21 лютага | – | Міжнародны дзень роднай мовы |
| 3 сакавіка | – | Сусветны дзень пісьменніка |
| 21 сакавіка | – | Сусветны дзень паэзіі |
| 27 сакавіка | – | Сусветны дзень тэатра |
| 2 красавіка | – | Міжнародны дзень дзіцячай кнігі |
| 15 красавіка | – | Міжнародны дзень культуры |
| 18 мая | – | Міжнародны дзень музеяў |
| 25 мая | – | Дзень філолага |

**7. Арганізацыя метадычнай работы**

Для арганізацыі дзейнасці метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ў 2023/2024 навучальным годзе прапануецца адзіная тэма ***«Удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў па пытаннях выхавання і развіцця асобы вучняў сродкамі вучэбных прадметаў „Беларуская мова“ і „Беларуская літаратура“»***.

На жніверьскіх прадметных секцыях настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры рэкамендуецца абмеркаваць наступныя пытанні:

1. Нарматыўнае прававое і навукова-метадычнае забеспячэнне агульнай сярэдняй адукацыі ў 2023/2024 навучальным годзе:

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншыя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах: асноўныя палажэнні, выхаванне ў сістэме адукацыі, агульныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу;

правілы бяспекі арганізацыі адукацыйнага працэсу, арганізацыі выхаваўчага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;

абноўленыя вучэбныя праграмы і вучэбна-метадычныя комплексы па беларускай мове і літаратуры для V–XI класаў;

эфектыўнасць выкарыстання ў адукацыйным працэсе кампанентаў вучэбна-метадычных комплексаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура»;

электронныя дадаткі да вучэбных дапаможнікаў па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Беларуская літаратура», размешчаныя на інтэрнэт-рэсурсе «Профільнае навучанне» (http://profil.adu.by): мэтавае прызначэнне, магчымасці выкарыстання пры вывучэнні адпаведных вучэбных прадметаў у X і XI класах на павышаным узроўні.

2. Аналіз вынікаў экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

3. Аналіз вынікаў работы вучэбна-метадычнага аб’яднання і іншых метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ў 2022/2023 навучальным годзе. Планаванне работы метадычных фарміраванняў на 2023/2024 навучальны год.

На працягу навучальнага года на пасяджэннях метадычных фарміраванняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры (вучэбна-метадычнае аб’яднанне, школа маладога настаўніка, школа ўдасканалення педагагічнага майстэрства, творчыя групы і інш.) рэкамендуецца разгледзець тэарэтычныя і практычныя аспекты выхавання і развіцця асобы вучня, пытанні методыкі выкладання вучэбных прадметаў у кантэксце разглядаемай тэмы з улікам эфектыўнага педагагічнага вопыту настаўнікаў рэгіёна:

камунікатыўная кампетэнтнасць настаўніка беларускай мовы і літаратуры як аснова прадуктыўнага ўзаемадзеяння з навучэнцамі з улікам іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей;

сучасны ўрок беларускай мовы і літаратуры: нарматыўныя прававыя і дыдактычныя патрабаванні, праектаванне, правядзенне і самааналіз;

функцыянальныя і змястоўныя магчымасці вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры як сродак развіцця і выхавання вучняў, фарміравання ў іх сістэмы сацыяльна-культурных каштоўнасцей, грамадзянскай адказнасці і патрыятызму;

прымяненне прыёмаў праектна-даследчай дзейнасці на вучэбных занятках па беларускай мове і літаратуры як спосаб развіцця навыку працы вучняў у групах, актыўнага іх уключэння ў працэс самаадукацыі і самарэалізацыі;

дыдактычны матэрыял да вучэбных заняткаў па беларускай мове і літаратуры як спосаб выхавання ў вучняў павагі да мовы, краіны, яе традыцый;

фарміраванне чытацкай адукаванасці вучняў на вучэбных занятках па беларускай мове і літаратуры.

З мэтай забеспячэння ўмоў для развіцця прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі праводзяцца мерапрыемствы ў адпаведнасці з Рэспубліканскім каардынацыйным

планам мерапрыемстваў дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў (*https://akademy.by/index.php/ru/aktual/37-anons-2*).

Навукова-інфармацыйную і арганізацыйна-метадычную дапамогу настаўнікам беларускай мовы і літаратуры аказвае навукова-метадычны часопіс **«Беларуская мова і літаратура»** (РУП Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»). Асвятляе пытанні моўнай і літаратурнай адукацыі, друкуе артыкулы з вопыту работы лепшых педагогаў, метадычныя распрацоўкі ўрокаў беларускай мовы і літаратуры, факультатыўных заняткаў, матэрыялы пазакласных мерапрыемстваў, заданні да тэсціравання і алімпіяд, займальны і дыдактычны матэрыял, дысертацыйныя даследаванні ў галіне педагагічных і філалагічных навук.